# Роля сям'і ў павышэнні эфектыўнасці работы адукацыйных устаноў, якія ажыццяўляюць інклюзіўную адукацыю

**Хабарава С. П.**

У цяперашні час інклюзіўная адукацыя выступае як прыярытэтны напрамак развіцця нацыянальных сістэм адукацыі розных краін [3]. Інклюзіўная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь разглядаецца як заканамерны працэс у развіцці адукацыі і ставіць сваёй мэтай забеспячэнне магчымасцяў для атрымання адукацыі ўсімі навучэнцамі, уключаючы дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, ва ўстановах асноўнай і дадатковай адукацыі [1, 2]. Адной з задач, накіраваных на дасягненне пастаўленай мэты, з'яўляецца павышэнне ролі і адказнасці бацькоў дзіцяці з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця ў атрыманні ім адукацыі.

Бацькі дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця з'яўляюцца паўнапраўнымі ўдзельнікамі адукацыйнага працэсу [1]. Яны выбіраюць з рэкамендаваных псіхолага-медыка-педагагічнай камісіяй ўстанову адукацыі для свайго дзіцяці з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця:

- ўстанова спецыяльнай адукацыі;
- ўстанова, у якім ажыццяўляецца інтэграванае навучанне і выхаванне;
- ўстанова, у якім ажыццяўляецца інклюзіўная адукацыя.

Бацькі нясуць адказнасць за прынящце рашэння аб выбары ўстановы адукацыі і адукацыйнай праграмы.

Супрацоўніцтва педагогаў і бацькоў – неабходны кампанент адукацыйнага асяроддзя: для таго, каб навучанне дзіцяці было паспяховым, абавязкова падтрымка бацькоў. Асноўнымі задачамі ўзаемадзеяння сям'і і спецыялістаў адукацыйных устаноў з'яўляюцца: вызначэнне агульных ўзгодненых мэтаў і зместу выхаваўчай дзейнасці; абмен вопытам выхавання дзяцей; сумесная абарона правоў дзіцяці; абмен інфармацыяй аб асобасных якасцях, асаблівых адукацыйных патрэбах дзіцяці; павышэнне педагагічнай культуры ўдзельнікаў педагагічнага працэсу, перш за ўсё бацькоў.

Арганізацыйныя формы ўзаемадзеяння сям'і і адукацыйных устаноў разнастайныя. Гэта індывідуальныя формы ўзаемадзеяння: гутаркі, тэматычныя індывідуальныя кансультацыі, наведванне сям'і дзіцяці, кансультацыі ў асабістым кабінеце педагога на сайце адукацыйнай установы і іншыя. Калектыўныя формы ўзаемадзеяння: бацькоўскі сход, дні адчыненых дзвярэй, бацькоўскія клубы, семінары, круглыя сталы, сумесныя конкурсы для дзяцей і бацькоў і іншыя. Праца педагогаў з бацькамі вядзецца з актыўным прыцягненнем нагляднай інфармацыі, выкарыстоўваюцца

відэафрагменты заняткаў з дзецьмі, тэматычныя выставы, сайты, памяткі для бацькоў, інфармацыйныя стэнды і іншыя. З улікам асаблівасцяў дзіцяці і ўмоў яго выхавання спецыялісты даюць бацькам рэкамендацыі па развіцці псіхічных функцый дзіцяці з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Бацькам прапануецца ўключаць дзяцей у хатнюю працу, прамаўляць выкананыя дзеянні, займацца сумеснай выяўленчай дзейнасцю, канструяваннем, чытаць кнігі, гутарыць аб прачытаным, арганізоўваць розныя гульні. Бацькам тлумачыцца неабходнасць наведвання з дзецьмі розных устаноў культурнага прызначэння, знаёмства дзяцей з прыродай, горадам для пашырэння уяўленняў аб навакольным. Асаблівую ўвага важна надаваць фарміраванні здаровага ладу жыцця дзіцяці. Залогам поспеху з'яўляецца прыняцце бацькамі каштоўнасці асабістага здароўя, рэальная дэманстрацыя прынцыпаў здаровага ладу жыцця на практыцы. Узаемны абмен ведамі, вопытам ўзбагачае і бацькоў, і педагогаў, садзейнічае павышэнню эфектыўнасці адукацыйнага працэсу.

Павышэнне якасці ўзаемадзеяння сям'і і спецыялістаў устаноў, у якіх ажыццяўляецца інклюзіўная адукацыя, можа ажыццяўляцца ў наступных напрамках:

– распрацоўка варыятыўных мадэляў сацыяльнага партнёрства адукацыйнай установы і сям'і дзіцяці з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця;

– забеспячэнне пераемнасці партнёрства адукацыйнай установы і сям'і на розных прыступках адукацыі;

– актывізацыя даследаванняў актуальных праблем сямейнага выхавання дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця;

– распрацоўка навукова-тэарэтычнага і метадычнага забеспячэння педагагічнай адукацыі бацькоў;

– навучанне бацькоў спосабам выхавання, адпаведным асаблівым адукацыйным патрэбам іх дзіцяці;

– павышэнне адказнасці бацькоў за навучанне і выхаванне дзяцей шляхам іх актыўнага далучэння і партнёрства;

– фарміраванне талерантнасці ва ўсіх удзельнікаў адукацыйнага працэсу.

## Літаратура


1. Интегрированное и инклюзивное обучение и воспитание детей с особенностями психофизического развития: учеб.- метод. пособие / В. В. Хитрюк [и др.]; под ред. Е. А. Лемех. – Минск : БГПУ, 2018. –144 с.
2. Концепция развития инклюзивного образования лиц с особенностями психофизического развития в Республике Беларусь // Спецыяльная адукацыя. – 2015. – № 5. – С. 3–10.

3. Педагогика инклюзивного образования / Т. Г. Богданова, А. А. Гусейнова, Н. М. Назарова [и др.] ;  под ред. Н. М. Назаровой. – М.: ИНФРА-М, 2016. – 335 с.